Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-09-21






# Хто жыве ў Беларусі?

Ганна ПАЛЯКОВА

Пытанне пра этнічны склад беларускай дзяржавы даўно цікавіла беларускіх даследчыкаў і навукоўцаў. Вядома, што на тэрыторыі нашай краіны пражываюць прадстаўнікі больш як 140 нацыянальнасцей. Поўныя звесткі пра этнас нашай зямлі цяпер знаходзяцца ў кнізе "Хто жыве ў Беларусі?", якая выйшла ў выдавецкім доме "Беларуская навука".

Праца над кнігай працягвалася больш як пяць гадоў, а матэрыялы для яе збіраліся дзесяцігоддзямі. Выданне складаецца з дзвюх частак. У першай распавядаецца пра нацыі, прадстаўнікі якіх жывуць у нашай краіне, пра іх традыцыі і звычаі. Гэтая частка прысвечана гісторыіі і культуры беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў, татараў, яўрэяў, цыганоў. Гэтыя этнічныя супольнасці пражываюць у нашай краіне шмат вякоў. Але выданне адметнае тым, што ў ім змяшчаюцца звесткі і пра тыя народы, якія з'явіліся ў Беларусі адносна нядаўна. Гэта в'етнамцы, карэйцы, афганцы, немцы і японцы. Цікава таксама, што ў кнізе ёсць інфармацыя пра першае ўпамінанне кожнага народа ў беларускіх дакументах, асаблівасцях рассялення і паходжання. У другой частцы кнігі — інфармацыя пра канфесіі, якія атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў Беларусі.

Падчас падрыхтоўкі выдання быў сабраны вельмі багаты матэрыял. Кніга мае цікавы змест, а таксама ўнікальнае афармленне. Матэрыялы выдання дапоўнены фотаздымкамі з асабістых архіваў аўтараў, ілюстрацыямі з фондаў музеяў і бібліятэк і нават картамі.

Кніга будзе цікавай не толькі этнографам, фалькларыстам, рэлігіязнаўцам, антраполагам, але і кожнаму, хто неабыякавы да гісторыіі і культуры свайго краю.

Ганна Палякова. Хто жыве ў Беларусі?